Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Пролетары ўсіх краін, злучайцеся!

# Чырвоная Зьмена

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 12 (394) Пятніца, 28 студзеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню: у сераду, пятніцу і нядзелю | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 903 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, Чырвоная Зьмена. Менск, Комсам. 25.

# Крывавай расправай не задушыць рэволюцыйны рух у Заходняй Беларусі!

**Дапаможам галадаючым сялянам Заходняй Беларусі! Хто што можа—ахвяруй сем'ям вязьняў.**

**Усю дапамогу трэба накіроўваць у бліжэйшую ячэйку МОПР'а, альбо праз рэдакцыю у Цэнтральны Камітэт МОПР'у. Рабоча-сялянская моладзь, на дапамогу заходнім братам!**

## Арыштаваных няма у чым абвінаваціць

### Грамада разагнана бяз дай прычыны

Пасьля разгону Беларускай Работніцка-Сялянскай Грамады ў Пілсудзкага была зроблена нарада з міністрам юстыцыі Мейштовічам.

У польскіх палітычных кругах гавораць, што Пілсудзкі нездаволен разгонам Грамады, бо гэта не дало абяцанага матар'ялу.

Некаторыя баяцца абурэньня нацыянальных меншасьцяў і заграніцы, бо Грамада разагнана бяз дай прычыны.

## Вёскі Заходняй Беларусі напоўнены даносчыкамі

Пасьля нападу польскага ўраду на беларускую „Грамаду" турмы ў Польшчы і Заходняй Беларусі перапоўнены беларускімі сялянамі. Зьняволеныя напісалі на імя сойму заяву, у якой апісваюць, што робіцца ў турме і патрабуюць тэрміновы абсьледваць яе. У заяве гаворыцца, што

**паліцэйскія і жандары практыкуюцца на зьняволеных, як трэба біць прыкладамі вінтовак і ручкам рэвольвэраў.**

За самы дробны протэст, зьняволеных закоўваюць у кайданы і б'юць шомпаламі. Разам з гэтым па ўсёй Польшчы і Зах. Беларусі ўрад шукае новых ахвяр.

### Па вёсках разаслана шмат шпіёнаў і данешчыкаў

Ім дапамагае саюз сялянскае моладзі, у які ўваходзяць пераважна сыны кулакоў і які падтрымлівае ўрад і мясцовая ўлада. Напрыклад, нядаўна ў вёсцы Букіна, Луцкай губэрні па даносу арыштавана некалькі сялян і паслана ў турму. Там вартаўнік Залкоўскі вымагаў ад арыштаванных, каб яны выкрылі патайную сялянскую організацыю. Арыштаваныя даказвалі, што яны ня ведаюць гэткай організацыі і што іх захапілі па няпраўдзіваму даносу кулакоў. **Не зважаючы на гэта, іх білі і засадзілі ў турму.**

## Дапаможам грашыма і збожжам

Паны ў Заходняй Беларусі прыгнятаюць нашых братоў. Я, асабіста шмат выцярпеў ад паноў. За вопраткуху польскаму салдату, які выцяў бізуном маю жонку, мяне хацелі застрэліць, і я ледзь выратаваўся. За шэсьць гадоў наша сялянства шмат перацярпела. Я ўяўлю сабе, як „соладка" жывецца сялянам Заходняй Беларусі, якіх палякі прыгнятаюць у працягу шасьці год. Трэба дапамагчы рабочым і сялянам Заходняй Беларусі. Агітацыю сярод сялянства па віны распачаць выпучэнцы. Сялянства можа дапамагчы грашыма, збожжам. Заняцца гэтай справай павінны камітэты сялянскай узаемадапамогі. Трэба на агульных сходах абмяркоўваць пытаньне аб зьбіраньні збожжа грошай і наогул усяго, хто што можа даць, а таксама выдзяляць з фондаў камітэтаў узаемадапамогі на карысьць галадаючых рабочых і сялян Заходняй Беларусі.

Тамашэўскі Міхась селянін Рэчыцкае акругі і раёну.

## Рабочыя і сяляне БССР дапамогуць

У адносінах белага тэрору Заходняя Беларусь займае першае месца пасьля Вугарыі. Рабочым і сялянам там жывецца дрэнна. Польская ўлада зараз прасьледуе беларусоў, жадаючы задушыць іх імкненьне да нацыян. і соц. вызваленьня. Паведамляюць, што сялянства церпіць голад і гора. Я лічу, што мы, рабочыя і сяляне, павінны дапамагчы насяленьню Заходняй Беларусі. Рабочыя чыгуначнікі могуць дапамагаць грашыма. Трэба правесьці дабраахвотны збор. Сяляне па магчымасьці дадуць хлеб, сала і збожжа. За гэту справу трэба ўзяцца як мага хутчэй.

Рабочы чыгункі ст. Ворша
Еўстафі Бобрык.

## Бедныя і серадняцкі адгукнуцца

У Польшчы катуюць зьняволеных, мучаць сялян-беларусаў. Праз газэты я даведалася, што сяляне галадаюць. Я лічу, што нашы сяляне і рабочыя павінны дапамагчы рабочым і сялянам Заходняй Беларусі, а таксама тым, хто сядзіць у турмах. Трэба дапамагаць па меры магчымасьці хто колькі можа.

Багамолава, сялянка Гомельскае акругі, Дзятлаўскага раёну.

### Бярыце прыклад!


Супрацоўнікі выдавецтва «Чырвоная Зьмена» ахвяроўваюць на карысьць галадаючых сялян Заходняй Беларусі сем пудоў і дзесяць фунтаў жытняй мукі.

## Братом Заходняй Беларусі

### На разгром „Грамады"

### Верш Якуба Коласа

Няхай паны ў сваёй дурноце
Мацней сьціскаюць абцугі,
Каб вас душыць у моцным гнёце,
Каб на калючым панскім дроце
Павесіць скарб наш дарагі;
Няхай ксяндзы, жрацы блюзьнеры,
Падпёршы тылам аўтар,
Выводзяць панскія намеры
З „сьвятых законаў" свае веры,
Каб болей сталася ахвяр;
Няхай шалее гэта зграя,
Няхай чадзіць „сьвяты" дурман,
Каб выбіць з беднага ратая
Прагненьне к волі таго краю,
Дзе ўпрошчэпіцца ўжо пан;
Няхай караюць там сурова,
Каб дух народу засадзіць;
Хай ужонд польскі слова ў слова
Бярэ прыклады з Мураўёва,
Каб рух спагніць, ахлусціць;
Няхай—„ад мора і да мора"—
Жыве ў закручаных мазгох,—
Браты, мінецца ліха-гора,
І панскі шал затхнецца скора
Бо стукне молат па панох!



## Што адбываецца у Заходняй Беларусі.

**3½ мільёны беларусаў пад прыгнетам паноў і жандараў.—6 год беларускае сялянства прасьледваецца і прыгнятаецца. У адказ на прыгнячэньне і гвалты беларускае сялянства організуецца для барацьбы.—Перапужаныя польскія магнаты і фашысты далі працоўным Заходняй Беларусі рашучы бой: сотні барацьбітоў кінуты у турмы, культурна асьветныя організацыі разбураны.—Панам і капіталістым ня ўдасца задушыць нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі.**

У Заходняй Беларусі, ў апошнія тыдні адбыліся вельмі сур'ёзныя падзеі. Буржуазна польскі ўрад зрабіў разгром беларускіх нацыянал-вызваленчых організацый, кінуў у турмы сотні беларускіх рабочых, сялян і іх правадыроў, абвясьціў масавую рабоча-сялянскую організацыю „Беларускую Сялянска-Рабочую Грамаду" нелягальнай.

### Гісторыя нядаўняга мінулага.

У 1920 годзе Заходняя частка Беларусі, з насельніцтвам амаль у $3^1/_2$ мільёны засталася ў межах польскай рэспублікі; калі паны зноў вярнуліся на сваю зямлю, становішча беларускага сялянства, і без таго разбуранага войнамі, пачало яшчэ больш пагоршвацца.

Як ніколі, беларусы адчувалі ўвесь жах нацыянальна соцыяльнага прыгнёту. Польскі ўрад, які мяняўся чуць ня кожны месяц мог, даць беларускаму насельніцтву толькі ваенныя пастоі і ўзлажыць на яе непасільныя падаткі. Сялянства, якое згаладалася па зямлі, жадала аграрнае рэформы, але аграрная рэформа, прынятая польскім соймам ня толькі не палепшыла становішча беларускіх сялян, але яшчэ больш пагоршыла яго, бо буйныя паны, зямля якіх была прызначана так званый „парцэляцыі" прадназначалася асаднікам Асадніцтва, калёнізацыя беларускіх зямель—былым польскім салдатам і афіцэрам, было праведзена польскім Урадам з тэй мэтай, каб узмацніць уплыў польскага элемэнту Заходняй Беларусі. Былыя салдаты і афіцэры, якія разьмеркаваліся сярод беларускага сялянства, заняліся гвалтамі і уціскам сялян.

У польскім сойме маецца больш 10 беларускіх дэпутатаў.

Польскі ўрад Заходняй Беларусі прыцягнуў на свой бок некалькі беларускіх авантурыстаў, якія за грошы прадавалі інтарэсы беларускіх сялян і з маўклівай згоды „гэтых дзеячоў" польская ўлада пачала граміць і разграміла беларуска нацыянальны рух, зачыніла каля 300 беларускіх школ, узмацніла экономічны прыгнет.

Забітае сялянства цярпела патрэбы і голад, прымушана была падстаўляць свае сьпіны пад бізуны польскіх жандараў. Але ўжо больш сьвядомыя беларускія рабочыя і сяляне аб'ядналіся ў комуністычную партыю Заходняй Беларусі для барацьбы з польскімі панамі і жандарамі. Лепшыя элемэнты працоўнай Беларусі ўступілі ў гэтую партыю, ня гледзячы на перасьледваньне польскай дэфэнзывы. Компартыя Заходняй Беларусі, вядома, знаходзілася і знаходзіцца цяпер ў нелягальным становішчы, польская ахранка з дапамогаю шпікаў і правакатараў перасьледвае гэтую партыю.

У выніку за апошнія 3 гады тысячы комуністых кінуты ў турмы. Створаны сотні працэсаў, па якіх рабочыя і сяляне Беларусі абвінавачваюцца ў дзяржаўным здрадніцтве і прыгаварваюцца да катаргі.

### „Беларуская Грамада."

Уціск польскага ўраду ня толькі ня зьмякчаецца, але з кожным днём усё больш узмацняецца. Непасільныя падаткі, бесканечныя натуральныя павіннасьці, эксплёатацыя польскімі панамі, забарона школ на роднай мове і голад,—усё гэта выклікала ў сял. моцнае бражэньне. Частка беларускіх дэпутатаў, якая ўпэўнілася, што польскі ўрад ня зьменіць сваёй політыкі, аб'ядналася і стварыла організацыю „грамаду", якая ўвяла ў сваю праграму шэраг запатрабаваньняў соцыяльнага і нацыянальнага парадку. Гэтыя запатрабаваньні былі вельмі далёкія ад лёзунгаў, якія высоўвала комуністычная партыя. Яны мелі на мэце абарону інтарэсаў беларускага сялянства ў межах польскай дзяржаўнасьці. Праўда, яны лічылі, што нацыянальнае вызваленьне можа прысьці адначасова з клясавым вызваленьнем і на сьцягу сваім напісалі: барацьба за надзяленьне сялян панскай зямлёю бяз выкупу і інш.

Калі ў маі Пілсудзкі зрабіў „аздараўленьне Польшчы" (пераварот)— частка сялянства спадзявалася, што ў Заходняй Беларусі павее сьвежы ветрык, што Пілсудзкі возьме новы курс і сялянства зможа лягчэй дыхнуць. Але прашло некалькі месяцаў, політыка ўціску і гвалту Заходняй Беларусі ня спынілася, становішча сялян усё пагоршвалася. На Заходнюю Беларусь насунуўся недарод, а з ім і голад з усімі яго жудаснымі вынікамі. Беларускія дэпутаты з грамады і сялянства ўпэўніліся, што толькі ўласнымі сіламі, толькі організаваным шляхам сялянства зможа дабіцца палягшэньня свайго становішча і беларуская грамада кінула сялянам кліч: організуйцеся! Адбылося нешта непрадбачанае. Сяляне масамі пачалі ўступаць у грамаду, кожны дзень у сёлах і вёсках вырасталі новыя організацыі, і да зімы грамада налічвала ўжо звыш 1200 вясковых гурткоў, якія аб'ядналі каля 100.000 сялян. Польскія паны спужаліся гэтага руху, іх ахапіла паніка.

### Барацьба з грамадою.

Выходзячыя ў Вільні польскія газэты, якія утрымоўваюцца польскімі панамі, з восені пачалі кампанію супроць грамады. Яны зацьвярджалі, што грамада гэта організацыя, якая быццам існуе на грошы прысылаемыя з Комінтэрну і Менску, што грамада—гэта быццамя фактычна комуністычная партыя, што грамада імкнецца адарваць Заходнюю Беларусь ад Польшчы і аб'яднаць яе з Савецкай Беларусьсю. Кампанія польскіх газэт была падтрымана шэрагам польскіх так званых крэсавых організацый, якія пасылалі ў Варшаву сваіх дэлегатаў з просьбай ліквідаваць грамаду. Газэты заняліся данасамі на беларускіх дэпутатаў, абвінавачвалі іх у падрыхтоўцы паўстаньня.

Паміж тым організацыя грамады расла. Лік гурткоў і сяброў усе павялічваўся. Грамада стала аўтарытэтнай сярод забітага беларускага сялянства. Грамада занялася культурнай працаю, уцягваючы ня толькі сялян, але жанчын і дзяцей. Польскія магнаты, ратуючы свае вялізарныя маёнткі, згаварыліся з Пілсудзкім. Пілсудзкі прыехаў у горад Нясьвіж, зараз адбываюцца вынікі гэтага візыту. Пасьля паездкі Пілсудзкага ў Несьвіж, а затым у Вільна, кампанія польскага друку супроць грамады ўзмацнілася. Польскія газэты былі поўны трывожных вестак. У іх друкаваліся лісты паноў і шляхты аб тым, што організаванае грамадой сялянства гэта ўжо ня былыя забітыя сяляне.

„З усюль—пісалася ў газэце «Кур'ер Віленскі»—асабліва з Усходу, мы абкружаны тэрыторыямі, якія гараць, нацыянал-беларускі рух органічна аб'яднаўся з рухам, які накірован да грамадзянскага перавароту. Беларускі рух ахапіў усіх бяз выключэньня праваслаўных беларусоў, нават дзеці і жанчыны запісваюцца ў гурткі, чакаючы вясною знаку да ўзбройнага паўстаньня. Збор аружжа ідзе поўным ходам, на вынік перавароту ўжо вызначаны адміністрацыйныя ўлады".

Другая Віленская чорнасоценая газэта „Слова" піша так: „Зараз у ціхай і спакойнай вёсцы аўладаў якісьці масавы псыхоз, людзі кідаюць працу і выконваюць яе часткова дыто нехаця. Усюды пануе якаясьці напружаная, нэрвовая атмасфэра. Чакаюць нейкіх вялікіх карэнных зьмен у дзяржаўным і грамадзкім жыцьці. Перамены гэтыя павінны наступіць у хуткім часе, можа і заўтра. Ніхто нічога толкам яшчэ ня ведае, але ўсе адчуваюць, што нешта павінна здарыцца".

Апавяшчаючы аб гэтым польскія газэты ўпарта патрабавалі ліквідацыі грамады, лічучы яе віноўнікам усіх бед. У гэтых паведамленьнях была доля праўды.

Яны паведамлялі, што ў вёсках, дзе організаваны гурткі, маюцца свае комэнданты і міліцыя. Ад слоў пілсудчыкі пераходзяць да справы.

Атрады фашыстых, якія падтрымоўваліся паліцэйскімі, урываліся ў будынкі, дзе адбываліся сходы ці конфэрэнцыі і зьбівалі сабраўшыхся. Дашло да таго, што павятовыя конфэрэнцыі грамады дэпутатам сойму прыходзілася склікаць у вёсках, але і там над імі ўчынялі расправу. Усяго толькі паўтары месяцы таму назад на конфэрэнцыю грамады ў вёсцы „Старое Вярозава", дзе прысутнічалі два беларускія дэпутаты сойму, адбыўся напад і фашыстыя разам з спэцыяльна прыбыўшымі паліцэйскімі атрадамі тут зьбілі каля 100 сялян, а таксама 2 беларускіх дэпутатаў польскага сойму, скрываўленые кашулі які былі кінуты ў сойме ў твар старшыні савету міністраў

### Разгром нацыянальна-вызваленчага руху.

Досыць шырока дэфэнзыва падрыхтоўвала ліквідацыю беларускага руху. У адзін і той жа дзень, ва ўсіх гарадох і вёсках Заходняй Беларусі, а таксама ў шэрагу гарадоў Польшчы былі праведзены масавыя арышты беларусаў У Вільні былі арыштаваны тры беларускіх дэпутаты правадыры Грамады: Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Валошын. У м. ку Глыбокае быў арыштаваны дэпутат Мятла Адначасова былі арыштаваны кіраўнікі і дзеячы нацыянальна культурных і асьветных устаноў. Ва ўсіх беларускіх організацыях, далёкіх ад політыкі, былі зроблены вобыскі, забраны дакуманты, канфіскаваны грошы, а працаўнікі засаджаны ў турмы.

У Вільні, Гародні, Беластоку, Навагрудку, Пінску, Глыбокім, Баранавічах, Саколцы, Сьвянцянах—усюды былі праведзены арышты беларускіх культурных працаўнікоў, беларускіх настаўнікаў, беларускіх сялян.

*Канец артыкулу—на 2 староньцы.*

# Што адбываецца ў Заходняй Беларусі.

*(Канец).*

Лік арыштаваных ня выяўлены, але можна дапусьціць што арыштавана каля 400 чалавек. Адных вобыскаў было зроблена звыш 650. Арышты былі зроблены таксама і сярод салдат-беларусаў у польскай арміі. Так'м чынам, зроблены поўны разгром ня толькі палітычнай беларускай арганізацыі, але і ўсіх навуковых, культурна-асьветных установаў, банку і інш.

Польскі ўрад зараз прабуе апраўдаць сваю дзейнасьць. Ён парушыў сваю „конституцыю", свой „дэмократызм", бо дэпутаты карыстаюцца, згодна польскай конституцыі, недатычнасьцьцю. У апраўданьне польскі ўраду выпушчаным і м офіцыйным апавяшчэньні заявіў, што дэпутаты арыштаваны на месцы злачынства", але на справе выявілася, што два дэпутаты былі арыштаваны ў начы ў сябе ў ложках, адзін дэпутат быў арыштаваны, калі зьбіраўся сесьці ў цягнік.

Польскі сойм да гэтага часу не адклікнуўся на арышты дэпутатаў. Зараз польскі міністр юстыцыі не безьвядомы чорнасоценец, абшарнік Мэйштовіч насьпех прад'явіў дэпутатам недарэчныя абвінавачаньні. Так, Тарашкевіч абвінавачваецца ў тым, што ён у 1925 годзе атрымаў ад Сялянскага Інтэрнацыяналу загад арганізаваць Грамаду і быццам у Данцыгу радзіўся аб гэтым з прадстаўнікамі компартыі і Комінтэрну. Тарашкевіч быццам бы організоўваў узброеныя атрады для барацьбы з Польшчай і комуністычныя ячэйкі ў вёсках і ў арміі. Усім дэпутатам прад'яўлена абвінавачваньне ў тым, што яны атрымоўвалі грошы „ад суседняй дзяржавы". Дэпутат Валошын абвінавачваецца ў тым, што ён арганізаваў напад на Віленскую і Лукіскую турму. Гэтыя нячувалыя абвінавачваньні, выдуманыя польскай ахранкай, маюць сваёй адзінай мэтай—разгром беларускага нацыянальнага руху і яго правадыроў.

## Пераследаваньне беларускай моладзі.

Рабоча сялянская моладзь Заходняй Беларусі ўвесь час была ў авангардзе барацьбітоў за нацыянальна-клясавае вызваленьне. Яе асабліва перасьледвалі польскія жандары. У Вільні на ўсіх процэсах супроць беларусаў, заўсёды абвінавачвалася шмат моладзі. Нядаўна па загаду віленскага ваяводы Рачкевіча моладзі было забаронена ўдзельнічаць на сходах «дарослых». Моладзь рашуча рэагавала на гэта, наладзіўшы ў дзень новага году дэмонстрацыю перад дварцом, дзе жыве ваявода. Зараз таксама арыштавана шмат моладзі ў Вільні, арыштаваны вучні беларускай гімназіі. З польскіх казармаў забрана і пасаджана ў турму сьвядомая беларуская моладзь, прынятая на вайсковую службу.

## Заходняя Беларусь у гэтыя дні.

Грамада—лягальная організацыя, якая існавала з дазволам польскага ўраду зараз разгромлена. Лепшыя прадстаўнікі беларускага насельніцтва мучацца ў турмах. Беларускія школы, клюбы, культурныя і коопэрацыйныя організацыі, ледзь існаваўшыя, зачынены. Беларускі банк, які дапамагаў мізэрна сялянству разгромлен. Беларускае сялянства прадстаўлена само сабе. У Заходняй Беларусі ў гэтым годзе неўраджай. У селяніна ўжо няма хлеба: ён галадае. Апошнюю карову селяніна забірае паліцыянт за неплацёж падаткаў. Зьдзекваньням і гвалтам з боку паліцыянтаў, жандараў і асаднікаў няма межаў, але і Пілсудзкаму яшчэ рана спраўляць перамогу, на месца кінутых у турму соцен барацьбітоў зьяўляцца тысячы новых. Ня ўдасца застанавіць нацыянальна-вызваленчы рэволюцыйны рух сярод беларускіх працоўных, якія скінуць уладу паноў і буржуазіі, бо побач з Заходняй Беларусьсю існуе Савецкая Беларусь, якая пасьпешна разьвіваецца дзе няма ўціску і гвалту, дзе няма паноў і капіталістых, дзе самі працоўныя і сяляне рашаюць свой лёс. Гэты факт ня можа не падсказаць сялянству Заходняй Беларусі, што толькі пасьледуючы прыкладу рабочых і сялян Савецкай Беларусі яны даб'юцца вызваленьня.

Г. ГРЫГОРЕЎ.

# Культурна-масавая праца Комсамолу Беларусі

## Даклад тав. РАТНЭРА на 4-ым пленуме ЦК ЛКСМБ

ТАВАРЫШЫ: За апошні час (я маю на увазе галоўным чынам васеньнія і зімовыя м-цы) мы прыкмячаем у організацыі некаторы перадом у бок паляпшэньня культурна-масавай працы. Вось некалькі конкрэтных прыкладаў. У галіне адукацыйнай працы сярод рабочай і сялянскай моладзі мы маем пашырэньне сеткі вячэрніх школ рабочай моладзі у горадзе і асабліва ў мястэчках, адчыненьне 150 вячэрніх школ сялянскай моладзі; у галіне організацыі адпачынку моладзі—ажыўленьне клюбнай працы, працы юнсэкцый, большае ўнядрэньне вечароў самадзейнасьці, чырвоных вечарынак у горадзе і ў вёсцы, павялічэньне выпярэднічтваў моладзі, галоўным чынам па лініі фізкультуры. Узмацнілася скарыстоўваньне кіно і тэатру (Менск паход рабочай моладзі у тэатр). Пачата праца па аб'яднаньню гарманістаў у вёсцы. Бабруйск, напрыклад, правеў акруговы зьезд гарманістых і г д. Усе гэтыя факты кажуць аб намеціўшымся пераломе.

### Кірауніцтва культурна-масавай працай

Вышэй названыя факты падкрэсьліваюць узрост увагі кіраўнічых органаў саюзу да справы паляпшэньня культурна масавай працы. Але-ж трэба адзначыць, што ініцыятыва АК, РК і ячэек у справе ажыўленьня гэтай галіны працы недастарчаючая, а ў іншых мясцох зусім слабая, Часта АК, РК і ячэйкі чакаюць адпаведнага цыркуляру «свышэ», невыяўлючы асааістай ініцыятывы. Вось напрыклад, газэта „Комсамольская Праўда" падняла за апошні пэрыод шэраг пытаньняў культурна-масавай працы: аб вытворчых сьвятах, аб працы з гарманістымі, усялякіх выпярэдніцтвах моладзі, аб тэхнічных гуртках і г. д. і належным чынам іх высьвятліла.

Нашы організацыі яшчэ не навучыліся падхопліваць гэтыя новыя формы, прапановы, каб іх праламаць на мясцох. Няма таксама дастатковага вучоту новых пачынаньняў у галіне культмасавай працы, якая праводзіцца ў ячэйках, і што асабліва важна—ячэйкі, юнсэкцыі не навучыліся яшчэ выяўляць з комсамольцаў і беспартыйнай моладзі тых таварышоў, якія сапраўды цікавяцца той ці іншай галіной культурнай працы і якіх магчыма было-б скарыстаць у якасьці ініцыятараў і організатараў таго ці іншага выгляду культурнай працы ў клюбах, юнсэкцыях, хаце чытальне. Такога актыву ў нас яшчэ няма і нашы агітпропы „парацца" таму, што павінны ўсю працу праводзіць самі. Слаба яшчэ прыцягваецца да нашай культурнай працы ў клюбах, юнсэкцыях—культурныя сілы.

### Задача практычнай увязкі культурнай працы з палітычнай працай і задачамі саюзу

Цяпер асаблівае значэньне мае задача практычнай увязкі культурнай працы з палітычнымі задачамі і працай саюзу. Скарыстаньне геаграфічнай карты, дачы агульных ведаў аб розных краінах—вось адзін прыклад такой увязкі культурнай працы з палітадукацыяй у працэсе прахаджэньня праграмы палітвучобы ў політшколах і політгуртках; вылучэньне большай увагі ў працы тэхнічных і сель-гасп. гурткоў, пытаньню паляпшэньня якасьці продукцыі, зьніжэньне сабекаштоўнасьці, коопэрыраванне насельніцтва і г. д —вось другі прыклад; азнаямленьне моладзі з адпаведнай мастацкай літаратурай у час прахаджэньня програмы політвучобы—вось трэці прыклад і г. д.

Памятаючы „што ў умовах перажываемага моманту ня можа быць політычнага выхаваньня і політычнай ролі саюзу паза і акрамя яго культурна-экономічнай працы ў першую чаргу", неабходна асабліва падкрэсьліць задачу ўвязкі і падчыненьне нашай культурнай працы, нашай грунтоўнай задачы комуністычнага выхаваньня моладзі ўважліва сачыць за тым, каб ячэйкі практычна праламлялі гэту лінію ў сваей працы; каб гаспадарча-грамадзкая праца ячэек усе больш паглыблялася і узмацнялася.

### Задача організацыі разумнага адпачынку моладзі.

Гэта задача мае вялікае значэньне тым, што яна на шэрагу з нашай экономічна-адукацыйнай працай павінна дапамагчы нам у справе барацьбы з адмоўнымі зьявішчамі ў быту моладзі, з хуліганствам і п'янствам, якія мы наглядаем сярод адсталай часткі рабоча сялянскай моладзі. Мы ставім цяпер перад організацыяй задачу:

а) больш шырокага скарыстаньня тэатру і кіно для разумнага адпачынку моладзі, праз колектыўнае наведваньне ячэйкамі тэатру, кіно. Адначасова трэба прыняць меры да ўдзешаўленьня і аблягчэньня доступу моладзі ў тэатры і кіно;

б) пашырыць вопыт організацыі выпярэдніцтваў моладзі: фізкультурныя, шашачна-шахматныя турніры, вытворчыя сьвяты і г. д.;

в) вылучыць больш увагі разьвіцьцю турызму сярод моладзі, экскурсіям;

г) пашырыць сетку літаратурных гурткоў, гурткоў чытаньня мастацкай літаратуры, унядрыць у клюбную працу літаратурныя вечары.

д) забясьпячэньне большай самадзейнасьці рабочай і сялянскай моладзі ў організуемых вечарох самадзейнасьці, чырвоных вечарынках, уцягненьне моладзі ў падрыхтоўку і практычнае правядзеньне гэтых вечароў.

Як у горадзе (пры юнсэкцыях), так і ў весцы (пры хатах-чытальнях і чырвоных кутках) неабходна паставіць практычную задачу выяўленьня і аб'яднаньня навакол юнсэкцыі, хаты чытальні, комсамольскай ячэйкі моладзі, якая можа быць скарыстана для ўдзелу ў працы па організацыі разумнага адпачынку моладзі. Трэба выявіць з моладзі тых якія граюць на музычных струмэнтах, танцораў, харыстых і г. д., пачаць з імі працу па азнаямленьню іх з задачамі і формамі нашай культурна-масавай працы па усваеньню новага рэпэртуару сьпеваў, частушак, матываў і г. д. і пад кіраўніцтвам ячэек скарыстоўваць іх у культурна-масавай працы. Нашы вясковыя організацыі павінны працягваць працу па згуртаваньню гарманістаў, зьвярнуць увагу на пашырэньне сеткі харавых гурткоў. Будуючы чырвоную вечарынку вясковыя організацыі саюзу павінны зьвярнуць больш увагі ўнясеньню момантаў разумнага адпачынку на пасядзелках, вячорках беспартыйнай моладзі, скарыстоўваючы з гэтай мэтай пад сваім кіраўніцтвам вышэй паказаны мастацкі актыў з моладзі; карыстаючыя найбольш легкімі выглядамі культурна-масавай працы як масавыя гульні, чыткі, вечары пытаньняў і адказаў, трэба паступова ўцягваць неорганізованую сялянскую моладзь у больш паглыбленую гурткавую працу пры хаце-чытальне.

Апошняе заўвважаньне, якое хачу зрабіць адносна адпачынку моладзі—гэта тое, што нашы гарадзкія ячэйкі, камітэты, юнсэкцыі павінны больш зацікавіцца і прыняць меры да ўтварэньня больш культурных абставін у інтэрнатах моладзі дабіўшыся актыўнай дапамогі з боку АкрАНА Акруговага аддзелу аховы здароўя і профсаю у. Трэба, каб у інтэрнатах была бібліотэчка-перасоўка, газэта, шашкі, шахматы, каб была забясьпечана чыстата і парадак.

### Некаторыя задачы у галіне адукацыйнай працы.

У сваім дакладзе коратка застанаўлюся на некаторых момантах Нам неабходна цяпер палепшыць якасьць вучобы ў ВШРМ і ВШСМ. Асабліва падкрэсьліваю задачу больш практычнага ўдзелу нашых організацый у справе зьнішчэньня няпісьменнасьці сярод моладзі, бо трэба адзначыць што адносіны некаторых нашых організацый да гэтай важнейшай справы „казенныя". Асаблівую важнасьці мае цяпер прасоўваньне кнігі і газэты ў гушчу моладзі. Нашы бібліотэкі павінны больш зьвязацца з ячэйкамі і юнсэкцыямі з мэтай прасоўваньня і популярызацыі кнігі. У рэзалюцыі мы прапануем організаваць пры комсамольскіх клюбах, пры бібліотэках колектывы «прыхільнікаў кнігі». У сваю чаргу ЦК, АК і РК на мясцох павінны прасачыць за прасоўваньнем юнацкай літаратуры,

*(Ад рэдакцыі.* Канец дакладу будзе надрукованы ў чарговым нумары)

# Чым жыве юнкор?

## Супроць „ліквідатараў" і ліквідатарства.

### Водгукі на артыкул Д. Сьмелага „Больш выразнасьці ў працы"

# Да пытаньня аб юнкораўскім руху.

## (У парадку абгаварэньня).

Надоечы, мне прышлося прачытаць у „Чырвонай Зьмене" артыкул Д. Сьмелага „Больш выразнасьці ў працы", які на мой погляд якраз ня даў „выразнасьці" ў юнкораўскім руху а наадварот яшчэ больш заблытаў яго.

З гэтага відаць, што аўтар зьяўляецца такім, што можа шмат напісаць, але сваёй выразнай думкі ня мае, ці сумысьля хоча заблытаць справу.

### Паперш(а)е чоткасьць і яснасьць

Ці ёсьць у нас юнкораўскі рух?

Юнкораўскі рух у нас існуе гадоў з пяць-шэсьць, сёньня шырока разгарнуўся, будзе і надалей існаваць зьяўляючыся аднэй з праяў актыўнасьці рабочай і сялянскай моладзі, аніякія перапалохі нашых „тэорэтыкаў" (у тым ліку і Д. Сьмелага) да нічога не прывядуць. Нечага пужацца т. Сьмелы! Трэба быць на справе сьмелым.

Я няведаю з чаго, але т. Д. Сьмелы набраўся да таго сьмеласьці, што выказваючы думкі «некаторых таварышоў»—кажа што па думках „некаторых" — юнкораўскі рух — гэта „пустая забава", Мне здаецца, што і тыя таварышы, якія і абгаварвалі пытаньні юнкораўскага руху да „пустой забавы" дагаварыцца не маглі, ня мелі права і не дагаварваліся, а т. Д. Сьмелы з перапалоху сам перакруціў іхнія думкі на свой капыл.

Аб ліквідатарстве няма чаго і гаварыць.

А вось аб унясеньні яснасьці і чоткасьці ў юнкораўскі рух гаварыць трэба.

Што за „птушка" юнкор? Гэта той, хто піша ў насьценныя і друкаваныя газэты аб жыцьці моладзі ва ўсіх яго праявах, будзь—то ў сельсавеце, на фабрыцы, у ячэйцы, у вёсцы і г. д — вось панашаму хто такі юнкор.

Але юнкор—адцягненае паняцьце—можа быць і юнкор на фабрыцы і юнкор у вёсцы. знача ёсьць юнрабкоры і юнвяскоры.

Ці мае права юнрабкор і юнвяскор пісаць ня толькі аб жыцьці моладзі сваёй фабрыкі, вёскі? І ці піша ён аб жыцьці прадпрыемства ўцалку, аб жыцьці вёскі ўцалку? Мае права, і піша ў большасьці выпадкаў. Знача юнрабкора мы маем права зваць рабкорам, а юнвяскора, таксама бяз „юн",—а проста вяскорам.

Адсюль адзін вывад—аніякіх адмяжаваньняў рабіць ня трэба, а проста побач з існаваньнем корэспондэнцкага руху сярод дарослых рабочых і сялян (які могуць пісаць пра жыцьцё моладзі). існуе і корэспондэнцкі рух сярод юнацтва (якое можа пісаць пра жыцьцё дарослых).

І гэта ня будзе ліквідатарскі настрой. Жыве моладзь, юнацтва—жыве і юнкораўскі рух, і казаць аб тым, што мы „гонім самі сябе ў магілу" ня трэба.

### Пра кіраўнічы цэнтр.

Бязумоўна, што і рабвяскораўскім рухам і юнрабвяскораўскім рухам кіраваць трэба. І зусім правільнай зьяўляецца сучасная пастаноўка: корэспондэнцкім рухам кіруе партыя праз рэдакцыі газэт А ці павінен комсамол прымаць удзел у гэтым? Бязумоўна павінен праз увязку партыйнага кіраўніцтва з інтарэсамі комсамолу — моладзі юнкораўскага руху. І нечага ў „бубны біць", што толькі „Чырвоная Зьмена"—кіраўнічы цэнтр юнкорамі А як быць з юнкорамі газэт „Гвязда Млодзежы", „Юнгер Арбэйтэр"? А яны будуць зноў крычаць „Юнгер Арбэйтэр"—кіраўнічы цэнтр юнкорамі", і г. д.

Неабходна стварыць сталае кіраўніцтва юнкораўскім рухам, які ахапляе каля 2000 юнкораў—з боку Цэнтральнага Камітэту Комсамолу Беларусі. А яго няма. Адгэтуль і перапалохі нашых „тэорэтыкаў" юнкораўскага руху. Гэтак Цэнтральнаму Камітэту неабходна:

— Правесьці вучот, і іншую працу па кіраўніцтву, юнкораўскім рухам праз паасобныя рэдакцыі (якую больш менш вызначыў Д. Сьмелы).

### Пра юнкораўскія гуртні

Трэба раз назаўсёды паставіць пытаньне: што можа аб'яднаць корэспондэнтаў для продукцыйнай працы? І адказ па нашаму просты—іх узрост. Знача там, дзе корэспондэнтамі зьяўляецца моладзь трэба захаваць юнкораўскія гурткі. Дзе юнкораў менш пры параўнаньні з дарослымі корэспондэнтамі — там трэба стварыць адзіны корэспондэнцкі гурток, прапрацоўваючы на ім і пытаньні юнкораўскага руху, а калі на прадпрыемстве альбо ў мястэчку маецца выстарчаючы лік і дарослых і юнацкіх корэспондэнтаў—там трэба захаваць абедзьве організацыі.

У сувязі з організацыямі корэспондэнтаў паўстае пытаньне і

### Аб насьценных газэтах

Усюды так,—што організацыі корэспондэнтаў узьнікаюць пры насьценных газэтах. На наш погляд, што пры абмяжаваным ліку корэспондэнтаў у тэй ці іншай мясцовасьці ніколі ня будзе страшным—калі корэспондэнты будуць выдаваць адну, агульную, але затое добрую па зьместу газэту не з «бруднымі радкамі» і без „адчуваньня рогату нашага будаўніцтва"—што рэкомэндуе т. Д Сьмелы--а сур'езную, з кутком жыцьця моладзі. Гэта адзін момант. Зразумела, калі корэспондэнцкія сілы зьяўляюцца моцнымі, шэрагі вялікімі—дык не пашкодзіць выдаваць і дзьве газэты—адну дарослую, другую юнацкую.

І проста дзіўным становіцца, калі таварышы нейкую „ліквідацыю" юнкораўскага руху бачаць у курсе зьліяньня насьценных газэт (юнацкай і дарослай).

### Не «затупляць», а загастраць

Канечным пунктам Д Сьмелага зьяўляецца «затупленьне» пытаньняў юнкораўскага руху. На наш погляд трэба не „затупляць". а загастраць.

Ці маецца ў нас літаратура, даступная літаратура па юнкораўскаму руху, на дапамогу ў працы юнкоргурткам і асобным юнкорам?

Ці маюцца ў нас прыблізныя програмы заняткаў, мэтоды правядзеньня працы з юнкорамі.

Вось гэтага няма.

Аб гэтым і трэба скласьці агульную думку, дзяліцца вопытам.

Юрка ГУЧОК.

# Як пазбавіцца прасьледваньняў?

## За павялічэньне тыражу „Чыр. Зьмены".

**(Лядзянскі раён, Аршаншчына).**

9 студзеня ў мястэчку Лядох па ініцыятыве РК ЛКСМБ адбылася нарада юнвяскораў Лядянскага раёну. Нарада адбылася ў памяшканьні Нардому. Абвестка дню была: вынікі 3-ай усесаюзнай нарады рабвяскораў; інформацыя аб распаўсюджваньні газэт у раёне.

Пасьля дакладаў дэлегаты абменьваліся думкамі па пытаньнях: аб расьледваньні, аб прасьледаваньні і інш.

Нарада зазначыла, што юнкораўскі рух толькі тады узрасьце, калі юнкоры аб'яднаюць вакол сябе ўсю моладзь і толькі тады юнкор ня будзе баяцца прасьледваньня.

Нарада юнвяскораў вынесла пастанову:—„кожны комсамолец, вясковы хлапец павінны выпісваць, чытаць і распаўсюджваць сваю родную газэту »Чырвоная Зьмена".

Нарада праша вельмі добра. Хутка адбудзецца другая юнвяскораўская нарада.

С. Кастрычнік.

# Перавыбары саветаў

## Бедната выбірае комуністаў і комсамольцаў.

### *Комсамольцау у сельсаветы*

**(Дрыбінскі р., Аршанскай акр.)**

Дрыбінскія комсамольцы сярод сялян ў пашане.

У многіх перавыбарчых вучастках прэзыдум, па жаданьню саміх сялян, складаўся выключна з комсамольцаў.

Сяляне ўсё больш і больш пераконваюцца ў працаздольнасьці моладзі аб'яднанай у комсамол. Напрыклад, адзін селянін казаў:

— „Хацелі кулакі навязаць сходу няпрыемную дзеля беднаты кандыдатуру ў сельсавет. Але на ліха яна нам, калі ў нас добры старанны комсамолец ёсьць!“

Як факт, што сяляне бачаць у комсамольцах рупліўых працаўнікоў, можа сьведчыць лічба абраных комсамольцаў.

У параўнаньні з мінулым годам лік комсамольцаў у асобных сельсаветах павялічыўся з 15 да 30 процантаў.

Сапраўды, Дрыбінскія комсамольцы—старанныя хлапцы.

Загадзя да перавыбараў, ячэйкі склікаюць сходы бедняцкай моладзі сумесна з лепшай часткай серадняцкай. На гэтых сходах абгаварваюць пытаньні перавыбарчага характару і ўжо на сходзе моладзь выступае арганізавана супроць кулакоў.

На трэцяга лютага, па скончэньні перавыбараў. Райком ЛКСМБ склікае нараду комсамольцаў - грамадзяньнікаў, моладзь абраную ў сельсаветы дзеля абгаварэньня некаторых пытаньняў іх далейшай працы.

Ул. Паскрэбка.

## Комсамолец—старшыня местсавету.

**(М. Талочын, Аршанскай акругі).**

Амаль усе комсамольцы прысутнічалі на перавыбарчых сходах.

І вынікі відавочныя. Калі ў складзе местачковага савету, абранага ў мінулым годзе, быў адзін толькі комсамолец, то пры сёлетніх перавыбарах 4 комсамольцы былі абраны членамі, а 1 комсамолец—кандыдатам местсавету.



Тав. ШАПІРА.

На 1-ым вучастку комсамолец Лісоўскі аднагалосна абіраецца ў члены местсавету. Таксама аднагалосна абіраецца і комсамолец Сушкоў на чыгунцы. Пры галасаваньні кандыдатуры комсамольца Шапіра на 3 цім вучастку з боку выбаршчыкаў чутно „вось гэта працаўнік“.

Малады рабочы-комсамолец Сьвяніцкі ў першы раз абіраецца ў местсавет,

Комсамольцы актыўна падтрымоўвалі кандыдатуры, рэкамэндуемыя парт'ячэйкай. Ні воднага выступленьня, ці галасаваньня проці гэтых кандыдатур не было. І ўрэшце сьпіс, рэкамэндаваны парт'ячэйкай праходзіць за выключэньнем толькі 1-га (некомсамольца).

Выступленьняў кулацтва і іншых дробнабуржуазных групак ні на адным з перавыбарчых сходаў ня было.

Першы пленум уноўабранага местсавету. „Комсамольскія дэпутаты“, адарваўшыся ад працы, усе зьявіліся на пленум.

Лісоўскі зрабіў справаздачу выбарчай камісіі.

Комсамольца Шапіра пленум абраў старшынёй местсавету.

Сьвяніцкі абраны дэлегатам на раённы зьезд саветаў.

Комсамольцам у савеце працы хапае.

Хутка пры местсавеце будуць створаны новыя камісіі. Патрэбна будзе ўцягнуць у працу гэтых камісій і комсамольцаў, якія не зьяўляюцца членамі местсавету.

Комсамольскія ячэйкі нашага мястэчку павінны зараз жа падвесьці вынікі ўдзелу комсамольцаў і моладзі ў перавыбарах местсавету, даць указаньні ў працы комсамольцам, абраным у местсавет і выпучыць у савет сваіх прадстаўнікоў.

Замацуем дасягненьні сёлетняй перавыбарчай кампаніі.

Міхась Зак.

## Актыунасьць моладзі узрасла.

**(Вёска Валоўнікі, Койданаўскі раён, Меншчына).**

На перавыбарах, якія ў нашай вёсцы адбыліся 14 студзеня, моладзь прымала актыўны ўдзел у абгаварваньні наказу дэпутатам і ў абгаварваньні таго ці іншага кандыдата высунутага ў сябры сельсавету.

Моладзь яшчэ загадзе абгаварыла каго высунуць кандыдатам у сябры сельсавету і высунула селяніна бедняка Адашкевіча Пятруся і Тарайкавіча Аўдзея, якія былі абодва абраны ў сельсавет.

Акрамя гэтага, на гэтым сходзе выбіралі ўпаўнаважаных па страхагэнцтву.

На перавыбарчым сходзе моладзь сьмела заявіла, што стары склад сельсавету працаваў дрэнна.

У сельсавеце не павінны сядзець п'яніцы,як нашы Валігурак і Хацкевіч.

Яшчэ моладзь скардзілася і на тое, што сельсавет не паклапаціўся аб паляпшэньні працы сярод яе.

Шмат яшчэ чаго гаварылі хлапцы і дзяўчаты. Апошнія баяліся, каб іх які небудзь дзядзька не зблаяў, бо на леташніх перавыбарах быў такі выпадак,—калі кандыдатам у сябры сельсавету была высунута дзяўчына Тарайковіч Марыля, дык адзін селянін сказаў—калі мы ў плуг пачнем запрагаць кароў, дык нічога імі ня зробіш, таксама будзе, калі мы ў сельсавеце пасадзім бабу. І дзяўчына ўцякла на двор, папрасіўшы, каб яе ня выбіралі сябрам сельсавету.

Сёлета дзяўчаты на гэта не зьвярталі ўвагі і амаль усе да аднэй зьявіліся на сход.

Юнкаскор Кастусь.

## Каго выбіраем?

На выбарчым сходзе мястэчка Валынцы, Валынецкага раёну прысутнічала шмат жанчын. Усяго выбаршчыкаў было 197 чалавек. У склад новага сельсавету прашлі кандыдатуры, якіх раілі партыйная і комсамольская ячэйкі.

Я. Ляўчынскі.

* * *

Вялікую ролю ў перавыбарах Баброўскага сельсавету, Жлобінскі раён, адыграла падрыхтоўчая праца, праведзеная комсамольскай ячэйкай.

Беднота і батракі ўсюды выступалі актыўна. У аднэй вёсцы заможнікі хацелі правесьці сваіх людзей, што вядома не ўдалося.

У склад новага сельсавету прашлі: 2 партыйца, 3 комсамольцы, 2 жанчыны і некалькі беспартыйных дзядзькоў-беднякоў.

Я. Быкаў.

* * *

На перавыбарчы сход у вёсцы Бібікі (Слабодзкі раён, Мазырская акруга) зьявіліся ўсе насельнікі, што маюць права голасу. Перавыбары прашлі актыўна.

Аказаліся абранымі ўсе беднякі. З іх: 1 комсамолец, кандыдат КП(б)Б (старшыня сельсавету), адзін партыец і адзін комсамолец прашоў у рэвізыйную камісію.

Сіроцкі.

* * *

У мінулым годзе, у Шумнянскім сельсавеце працавала чатыры комсамольцы. З іх адзін быў старшынёю сельсавету.

Выбіраючы новы сельсавет, усе сяляне галасавалі за комуністых і комсамольцаў.

В. Ашкераў.

# Становішча вучнёуства на прадпрыемствах.

**Што кажуць весткі з месц?—Шмат хлапцоў, замест таго каб вучыцца заліваюць„ за гальштук“.—Саматужнікі вельмі дрэнна адносяцца да вучняў, падчас звальняючы вучня, як толькі апошні перарасьце вучнёўскі ўзрост.—У саюзе працаўнікоў мастацтва няма праграмы вучнёўства.—Якія захады да палепшаньня вучнёўства прымаюць профэсыйныя і савецкія ўстановы?**

## ЦСПСБ клапоціцца аб вучнеўстве

**(З гутаркі з прадстаўніком ЦСПСБ т. Каганам).**

ЦСПСБ супольна з Нар. Кам. Працы распрацавалі законапраэкт аб правілах вучнёўства ў дробна-саматужнай прамысловасьці і прамысловай коопэрацыі. Законапраэкт унесены на разгляд Савету Народных Камісараў і ЦВК БССР.

Галоўныя вехі законапраэкту гэткія: а) вучнёўства павінна лічыцца ў сваім стане да 20-ці гадовага ўзросту (а не да 18 г., як цяпер), б) зарплата яго (1-е паўгодзьдзе ў вёсках за адны харчы) не павінна залежыць ад „дзяржмінімуму“.

Прыведзенымі мерамі ЦСПСБ разьлічвае палегчыць абставіны ўтрыманьня вучнёўства, і тым самым павялічыць агульны лік яго.

Другім ня менш важным момантам у клопатах аб вучнёўстве трэба прызнаць перагляд існуючых праграм у фабзавучах.

Заснаваная па гэтаму пытаньню камісія пры Нар. Кам. Працы мае таксама на ўвазе скараціць тэрмін навучаньня ў гэтых школах і праз тое паменшыць выдаткі на іх.

Трэцім момантам зьяўляецца грунтоўны досьлед абставін вучнёўства ва ўстановах дзяржаўнай прамысловасьці па Менску, Віцебску і Барысаву.

Увесь дасьледчы матар'ял па гэтай галіне адыграе ролю меркі, на грунце якой ЦСПСБ мае будаваць далейшыя меры палепшаньня быту вучнёўства на нашых фабрыках і заводах.

Сучаснае нездавальняючае становішча яго трэба спадзявацца будзе палепшана ў хуткім часе.

М. В.

## Ну калі-ж будзе?

**(Сярод вучнёўства саюзу працаўнікоў мастацтва).**

У нашым саюзе працаўнікоў мастацтва, вучні ўсіх спецыяльнасьцяй (фотографы, кіно мэханікі, рабочыя сцэны) ужо 3 год працуюць без праграмы. З гэтай-жа прычыны значным чынам затрымліваецца павялічэньне заробку і кваліфікацыя вучня.

На гэтых днях на кваліфікацыі вучняў кінамэханікаў, група адміністрацыі правяліла ўсіх вучняў-комсамольцаў.

Вышла гэта з таго, што яны вучыліся ня маючы праграмы. А адміністрацыя задавала такія пытаньні, на якія не адкажа і майстар. А загадчык кіно зьбіваў з толку вучняў, як бы няўзнак, вырываючы якую небудзь частку з машыны.

Калі праграму не прысылаюць з Масквы, трэба прадстаўніку моладзі ў саюзе самому скласьці яе якую на даць на разгляд у ячэйку, саюз, секцыю і г. д.

Наглядаецца ў працы нашага саюзу і тое, што гаспадары прыватных фотографіяў зьнімаюць з працы тых вучняў, якім трэба падымаць катэгорыю, а на іх месца бяруць новых вучняў, якім трэба плаціць усяго 12 рублёў,

Трэба прадстаўніку моладзі прыняць належныя захады каб гэта выжыць.

Фото.

## Вучнёуства швэйнікау

### Падросткі і бронь

Усяго налічваецца па Менску і Віцебску падросткаў [да 17 год)—155 чал.

Бронь запоўнена цалком (8 проц. агульнага ліку рабочых).

### Вучоба

У 2-х школах фабзавуча Менскай і Віцебскай лік вучнёўства—40 чал. Курс навучаньня 3-х гадавы. Прынятая ў ФЗВ моладзь карыстаецца стаўкай 1-га разраду—19 р. 37 к. у месяц, выпускнікі—6-га разраду—47 руб.

Складзеныя саюзам і НКПрацы праграмы школ патрабуюць перагляду.

### Хібы быту

У першую чаргу трэба адзначыць што выпускнікі ФЗВ накіроўваюцца часта не па сваёй галіне:

Спэцы па шыцьцю паліта ідуць у брэзэнтшчыкі і—наадварот—і г. д.

Неабходна гэтыя трагікамэдыі сярод швэйнікаў спыніць як найхутчэй.

Потым кідаецца ў вочы вось што: 18 вучняў ФЗВ у Менску ўціснуты, як селядцы ў бочцы, у невялічкі пакойчык (3 кв. саж.)

Вучацца і разам „прэюць“...

Няўжо гэта нормальна?

М.

## Брудныя норавы

**(Сярод комунальнай моладзі г. Менску)**

Агульны лік падросткаў на прадпрыемствах, ахопленых саюзам комунальнікаў, дасягае зараз па БССР—93 чал (большасьць працаўнікі цырульняў). Бронь складае—35 чал ва ўзросьце да 18 год) Беспрацоўных падросткаў з ліку сяброў саюзу—25 чал.

Вялікай адмоўнасьцю зьяўляюцца беспрацоўныя ў стане ўтрыманцаў саюзу—да 1.500 чал. (дворнікі, іх дзеці, прачкі і пажарнікі).

З-за адсутнасьці клюбу гэта рацьць, як сьведчыць саюз, у будучыне дасьць краю некалькі лішніх сотняў «махровага» хуліганства.

І вось чаму:

Школа ні ў якай меры гэту рацьць не закранула. Беспрацоў'е пьянства, карты і распуства (часьцей прышчэпліваліся гэтыя „фрукты“ ў цырульнях!) канчаткова дэклясыравалі хлапцоў—„комунальнікаў“.

Уся карысьць, якую атрымоўваюць яны ад саюзу, зводзіцца да „па ек“ на імя юнсэкцыі аб працы. КСМ абхапіў іх на 5 проц.

Але ўсё-ж такі пытаньне аб палепшаньні быту іх праядаўжае быць балючым і безадкладным.

Нельга-ж ісьці сьвядома на сустрэч росту кадраў хуліганства.

М. В.

## Вучні хуліганяць.

**(Майстэрні ст. Менск МББ чыгункі).**

На адчыненых у Менску МББ чыг. 2-х цэхах—сталярным і кацёльным агульны лік вучняў—147 ч. Выпускнікоў у гэтым годзе будзе—40 асоб, якія ўсе накіроўваюцца на вытворчасьць.

Досьлед выявіў нязвычайнае разьвіцьцё сярод цэхавой моладзі п'янства і хуліганскіх праяў.

2 падросткі знаходзяцца пад сьледзтвам, а 6—зьняты з працы за сімуляцыю хвароб і... „панажоўшчыну“ з таварышамі на глебе сваркі.

Белбюро ЦК чыгуначнікаў пашырае культпрацу сярод цэхавога вучнёўства, дзеля барацьбы з прагуламі і хуліганствам.

К.

# Беспрацоў'е сярод падросткаў у БССР.*)

## Мерапрыемствы па барацьбе з беспрацоўем.

На пытаньне аб мерапрыемствах мы знаходзім адказы:

Па заявах Наркампрацы БССР спэцыяльных сродкаў на барацьбу сярод падросткаў і на правядзеньне спэцыяльных мерапрыемстваў было дапатрабавана каля 50000 руб. Пры тым акрамя гэтага ліку сродкаў, таксама ў вядомай меры будуць ахоплены і падросткі тымі агульнымі мерапрыемствамі, якія будуць праводзіцца Наркампрацай у справе барацьбы з беспрацоўем.

Паказаная сума прызначаецца галоўным чынам для таго каб мы мелі магчымасьць арганізаваць вядомы лік брыгад з моладзі пры прац колектывах.

Вядома, што гэтая лічба, пры яе нават поўным атрыманьні ня зможа здаволіць тых патрабаваньняў, якія нам зараз прад'яўляюцца, але яна таксама ў значнай меры будзе дапамагаць зьменшэньню беспрацоўя сярод падросткаў.

Побач з гэтым Наркампрацай ў вытворчым пляне намячаецца організацыя новых і пашырэньне ўжо існуючых прац колектываў, што безумоўна ў вядомай меры дасьць магчымасьць унедрыць вядомы лік у іх моладзі.

Аднак неабходна падкрэсьліць што організацыі ЛКСМБ да пытаньняў унядрэньня падросткаў ў прац-колектывы падходзяць яшчэ ня з усёй сур'ёзнасьцю напр: проц. падросткаў у прац колектывах параўнаўча з мінулым.

У гэтым годзе трэба будзе паставіць працу такім чынам, каб захаваць абавязкова процант падросткаў у прац-колектывах такі, які яны складаюць да агульнага ліку беспрацоўных (дарослых), зарэгістраваных на Біржы Працы (12 процантаў)

Трэцяе мерапрыемства зьяўляецца ўцягваньне падросткаў і моладзі на праведзімыя грамадзкія работы па вызначанай праграме Наркампрацы. Грамадзкія работы БССР у 27 годзе павінны быць павялічаны на 20 25 процантаў параўнаўча з мінулым годам.

Надзвычайна важным пытаньнем у справе зьмягчэньня беспрацоўя сярод падросткаў зьўляецца навучаньне і перанавучаньне складу беспрацоўных часткова падросткаў. Гэтаму ў вядомай меры дапамагалі організаваныя курсы Цэнтральным Інстытутам Працы. Вопыт іх існаваньня паказаў, што гэтае мерапрыемства ўпаўне апраўдвае пытаньне аб пашырэньні курсаў ЦІП'у і цяпер Народны Камісарыят Працы распрацоўвае пытаньне аб пашырэньні курсаў ЦІП і організацыі новых часткова па дрэваапрацоўчай вытворчасьці. Нашым організацыям ЛКСМБ трэба будзе прыняць усе захады да таго, каб унядрыць у іх вядомы лік падросткаў.

Апрача гэтага цяпер трэба будзе паставіць ва ўсю шырыню пытаньне аб організацыі рознага роду профтэхкурсаў хоць-бы і на самаплаце з тым, каб можна было даць падросткам атрымаць вытворчую кваліфікацыю. На організацыю рознага роду курсаў Галоўпрофасьветай (машынапісі, стэнаграфіі, бухгальтэрыі, трактарыстых і г. д.) трэба будзе ўцягнуць вядомы лік беспрацоўных падросткаў з тым, каб яны маглі там атрымаць якую небудзь кваліфікацыю.

Вялікае значэньне ў справе зьмягчэньня беспрацоўя сярод падросткаў мае ўнядрэньне вучнёўства ў дробна-саматужную прамысловасьць. Тут у нас ня ўсё ў парадку. Па прыблізных вестках мы маем толькі каля 1800 чалавек падросткаў у гэтай прамысловасьці. Распрацованыя правілы аб вучнёўстве ў саматужнай прамысловасьці дадуць яшчэ большую магчымасьць да ўнядрэньня ж падросткаў. Організацыям КСМ і профсаюзаў трэба будзе ўзяць лінію на шырокае разьвязаньне гэтых правіл як сярод саматужнікаў, так і моладзі. Цяпер трэба практычна распрацаваць шэраг мерапрыемстваў да ўнядрэньня моладзі ў арцелі прамысловай коопэрацыі, што дасьць магчымасьць таксама зьмягчыць беспрацоўе сярод падросткаў.

Акрамя ўсіх гэтых мерапрыемстваў організацыям ЛКСМБ трэба ўзяць больш рашучую лінію на правядзеньне дырэктыў аб разбраніраваньні непадросткаў і запаўненьні броні.

Ап. Джэлюк.

*) Пачатак гэтага артыкула глядзі ў папярэднім нумары нашай газэты.

# САЮЗНЫЯ НАВІНЫ

(У ЦК ЛКСМБ).

## Абсьледаваньне ЛКСМБ.

Для абсьледаваньня ЛКСМБ з Масквы прыехаў інструктар ЦК Усе ЛКСМ тав Файнбэрг.

У бліжэйшы час будуць абсьледаваны Віцебская і Слуцкая акруговыя організацыі Комсамолу.

## Даклад ЦК ЛКСМБ на пленуме ЦК КПБ.

На чарговым пленуме ЦК КПБ будзе заслухан даклад тав. Бараньнікава аб працы ЦК ЛКСМБ.

## Даклад аб становішчы рабочай моладзі.

У бліжэйшыя дні на пасяджэньні бюро ЦК КПБ будзе заслухан даклад аб становішчы рабочай моладзі Беларусі.

## Да акруговых конфэрэнцый ЛКСМБ.

Зацьверджаны наступныя тэрміны скліканьня акруговых конфэрэнцый ЛКСМБ: менская—5 лютага, аршанская—6-га, мазырская—10 га, віцебская—15-га, полацкая—14-га, магілеўская — 9-га, калінінская—7-га, слуцкая—7-га, бабруйская—12-га.

* * *

Прадстаўнікамі ЦК ЛКСМБ на акруговыя конфэрэнцыі ЛКСМБ зацьверджаны наступныя таварышы: Ворша—Адзінец, Калінінск—Галодка, Полацк—Шаліма, Менск і Барысаў—Бараньнікаў, Мазыр і Віцебск—Галавач, Магілеў—Мірынгоф і Слуцк—Ратнэр.

* * *

У бліжэйшы час у „Чырвонай Зьмене“ пачне зьмяшчацца старонка „Да акруговых конфэрэнцый“, у якой будуць высьвятляцца тыя пытаньні комсамольскай працы, якія будуць абгаварвацца на акруговых конфэрэнцыях.

## Новы склад выдавецтва „Чырвоная Зьмена“.

Бюро ЦК ЛКСМБ зацьвердзіла новы склад праўленьня выдавецтва „Чырвоная Зьмена“: старшыня праўленьня—Вержбаловіч, сябры праўленьня—Курцік і Ратнэр, кандыдат ў сябры праўленьня—Сольц.

## 75 кілемэтраў па засьнежаным палям

### Лыжны прабег барысаўскіх комсамольцаў

22 студзеня 6 барысаўскіх комсамольцаў-фізкультурнікаў прыстроілі да ног лыжы і рушылися па засьнежаных палёх у Менск.

75 кілёмэтраў ад Барысава да Менску—ладны кавалак!

У першы дзень надворра вельмі спрыяла прабегу. Быў гладкі сьнег. Лыжы ішлі легка. За 4 гадзіны гэтага дню ўдалося прайсьці 45 кілёмэтраў.

Заначавалі ў адной вёсцы.

На заўтра пашоў легкі, ліпкі сьнег. Ён прыліпаў да лыжаў. Ісьці было цяжка.

Апошнія 30-35 кілёмэтраў барысаўцы пакрылі з большай цяжкасьцю чымся першыя 45 кілёмэтраў.

Каля Менску, на барысаўскім шляху барысаўцаў сустрэлі Менскія лыжнікі ў ліку звыш 200 чалавек.

Ю. К.

## Новая кузьня кваліфікацыі

Пастановай Белдзяржтрэсту шкляной прамысловасьці ў восень г. г. пры заводзе імя Домбаля ў Нова-Барысаве адчыняецца цэнтральная школа вучнёўства шкляной прамысловасьці.

Школа будзе рыхтаваць высокакваліфікаваных майстраў шкляроў для ўсяе БССР.

Пры школе будзе організавана абшчажыцьце для вучняў на 30 чал.

На організацыю школы адпушчана 19.500 руб.

## Профшкольцаў—у профсаюз.

Менскі АК ЛКСМБ падвеў вынікі конфэрэнцыі профтэхшкол і ў зьвязку з гэтым вынес наступную пастанову: праз ЦК ЛКСМБ паставіць пытаньне ў прэзыдыуме ЦСПСБ аб прыёме профшкольцаў у профсаюзы большай зацікаўленасьці профсаюзаў жыцьцём профшкол.

## 1905 У 1927

Марозная, сіверная раніца. Вуліцы запруджаны атрадамі ўзброеных кавалярыстых. Качаюцца ў паветры пікі і вінтоўкі. Атрады пільна сачаць за рухам на вуліцах і да часосьці рыхтуюцца. Абывацель з апаскай жмецца да сьцен, ён чуе нейкую небясьпеку..

А на дворы «Пуцілаўскага заводу» сабраліся рабочыя. Толькі што яны атрымалі вестку аб звальненьні з працы шэрагу сваіх таварышоў, якія за штосьці не спадабаліся адміністрацыі Рабочыя ўсхвалявана перагаварваюцца паміж сабою. Урэшце яны рашаюць пратэставаць супроць пазбаўленьня сваіх таварышоў кавалку хлеба. Адчуваецца нейкі ўзьняты настрой, які бывае толькі перад вялікімі падзеямі...

На адмову адміністрацыі заводу прыняць зноў на працу зволеных таварышоў, нехта гучна выкрыквае: „прэч фабрыкантаў“! Гэты выкрык зараз жа падхапляецца ўсім натоўпам, пераносіцца па дворы і чутны на ват на вуліцы.

Чумазы рабочы ўносіць прапанову кінуць працу і баставаць. Няма ніводнага голасу супроць гэтага і забастоўка абвяшчаецца пад гучнае „Ура“!

Па розных пунках гораду адбываюцца рабочыя мітынгі протэсту. На ўсіх мітынгах выносяцца рэзолюцыі аб падтрыманьні „пуцілаўцаў“, аб ўсеагульнай забастоўцы і выхаду ўсіх рабочых на дэмонстрацыю.

Сказана—зроблена. Рабочыя выстрайваюцца і шырокімі калёнамі рухаюцца на Віленскі вакзал. І тут мітынг протэсту.. Зьяўляецца „поп Гапон“, які ўгаварвае рабочых пайсьці з просьбай пэтыцыяй да „царабацюшкі“. Цар-жа зьлітуецца над сваімі „дзяцьмі“ і задаволіць іх запатрабаваньні! ..

Натоўп так і робіць. Ідуць наперад рабочыя масы с портрэтамі цара ў рукох...

А казакі? Яны ўжо сабраліся каля «Зімняга дварца» утварыўшы ланцуг і ня пушчаюць дэмонстрантаў ісьці далей. Калі-ж апошнія ня спыняюцца—афіцэр дае каманду і рап- там... раздаецца залп, за ім другі... трэці... Паніка, крыкі, частка дэмонстрантаў падае пад кулямі, а частка бяжыць.. На срэбным сьнезе—кроў...

Казакі рассейваюцца па ўсіх вуліцах і захапляюць дэмонстрантаў.

Яшчэ доўга чуліся на вуліцах выстралы і крыкі... Спушчаўся вечар...

* * *

Чытач пэўна думае, што мы яму малюем крывавыя падзеі 1905 году. Але гэта «крыху» ня так. Мы проста далі апісаньне масавай інсцэніроўкі здарэньняў 1905 году, якая была наладжана 22 студзеня гэтага году на вуліцах Менску піонэрорганізацыяй Ляхаўскага раёну.

Я. ЗЭЛЬЦАР.
А. РУЗАЎ.



## У тры радкі

▣ Усебеларускі зьезд рабочых-хімікаў адбудзецца ў Менску 1 3 лютага.

▣ 2.000.000 руб. будуць выдадзены ўрадам у бягучым годзе на новае кватэрбудаўніцтва БССР.

▣ Белавіяхім абвясьціў конкурс на лепшы проэкт парашутаў-кошыкаў для скіданьня паштовых галубоў з самалётаў.

▣ Клюб моладзі ўтвараецца ў Менску саюзам камунальнікаў у зьвязку з далучэньнем да яго электрастанцыі (ад саюзу мэталістаў) з гатовым клюбам.

▣ Паказальны каток адчынен у Гомлі Акруговым Саветам Фізкультуры. Хутка організуецца тамака-ж лыжная станцыя.

▣ Беспрацоўе па БССР за апошні месяц выяўляецца ў 19 172 чал. (у лістападзе было 18 815 чал.)

## Вячэры для рабочай моладзі.

Даводзіцца да ведама Менскай рабочай моладзі, што з 3 лютага г. г. комсамольская сталоўка будзе адпушчаць па танным цэнам масавыя вячэры, акрамя нармальнага водпуску сьнеданьняў і абедаў.

# Суд над „Чырвонай Зьменай“

Суд над газэтай «Чырвоная Зьмена» пераносіцца на нядзелю 30 студзеня г. г. у памяшканьне актавай залі БДУ (Земляробскі зав.).

Пачатак а 7 гадзіне. Пасьля суду адбудзецца концэрт.

Білеты па юнсэкцыях. Спазьніўшыхся ня будуць пушчаць у залю.

# На усебеларускіх спаборніцтвах па цяжкай атлетыцы.

24-га студзеня (2-гі дзень) адбыліся два рухі па цяжкай атлетыцы (рывок двума і талчок аднэй).

У рыўку двума лепшыя дасягненьні паказалі: у вазе пяра—Бусловіч (Барысаў); у лягчэйшай вазе—Савіч (Орша); у лёгкай—Яськевіч (Орша) і Равічбах (Барысаў); у сярэдняй—Андрэяў (Магілеў); у паўцяжкай—Кузьмін (Менск).

У талчке аднэй: у лягчэйшай вазе—Савіч (Орша); у лёгкай—Яськевіч (Орша); у сярэдняй—Андрэяў (Магілеў); у паўцяжкай—Кузьмін (Менск).

Апошняя частка дню была прысьвечана французскай барацьбе.

Пераможнікамі 1-га кола па барацьбе аказаліся: у лягчэйшай вазе—Караткевіч (Менск) і Хадасоўскі (Магілеў); у лёгкай — Шаматульскі (Магілеў) і Мікеніцкі (Менск); у сярэдняй—Руткоўскі (Орша).

Ю. К.

## Запытаньні і адказы

Запытаньне № 788 (М. Е). Ці мае права комсамолец скідаць абразы ў хаце, калі яму гэта не дазваляе бацька ці маці?

Адказ. Калі бацькі супроць таго, каб зьняць абразы, дык, безумоўна, гэта рабіць ня трэба. Комсамолец павінен гэтага дабіцца паступовым растлумачэньнем непатрэбнасьці абразоў.

Запытаньні № 789. (Н.). Якую працу павінны весьці студэнты-партыйцы і комсамольцы, якія прыехалі на вакацыі ў вёску?

Адказ. Яны шмат чаго могуць зрабіць за час вакацый. У першую чаргу павінны праводзіць масавую культасьветную працу. Наогул дапамагаць вясковым партыйным і комсамольскім ячэйкам у іх працы.

Запытаньне № 790 (М. Ц.). Чаму „Чырвоная Зьмена“ не дае матар'ялаў дзеля распрацоўкі на занятках юнкораўскіх гурткоў?

Адказ. „Чырвоная Зьмена“ такі матар'ял пэрыодычна зьмяшчае. Вось, напрыклад, у № 11 ад 26 студзеня ёсьць гэтакі матар'ял.

Запытаньне № 791 (СХ). Ці можа бюро ячэйкі прыняць у сябры КСМ хлопца, які некалькі месяцаў таму назад выбыў з ячэйкі механічна?

Адказ. Тут у кожным асобным выпадку патрэбен асобны падыход. Калі хлапец ужо справіўся, стаў больш дысцыплінаваным—дык можна яго прыняць у КСМ на агульных падставах.

Запытаньне № 792 (Селькомс). Колькі павінен атрымліваць зарплаты ў месяц вясковы ліквідатар няпісьменнасьці?

Адказ. Ліквідатар няпісьменнасьці, у якога вучыцца менш чым 15 вучняў і які вядзе працу дробнакамплектным, альбо індывідуальным парадкам, павінен атрымліваць па 5р. за кожнага вывучанага няпісменнага. Тыя-ж ліквідатары у якіх вучыцца па 15 і больш чал. і якія вядуць працу па поўнаму камплекту павінны атрымліваць па 10 рублеў кожны месяц у працягу навучальнага сэзону. Апрача гэтага, па сканчэньні вучэбнага сэзону і падліку ўсей гадовай працы ліквідатары маюць права на асобныя дадатковыя прэміі.

## Паштовая скрынка.

**С. Кал'не.** Колькі не „пацела“ рэдакцыя над тваімі вершамі каб што небудзь ды зьмясьціць, аднак нічога ня вышла. Вершы слабыя. Чытай больш літаратуры і прыглядайся як пішуць другія.

**Я. Трушкову.** (Клімавічы). Верш „Янку Купалу“ слабы.

**Кіроту.** „Да 9-га кастрычніка“ ня пойдзе. Вучыся!

**Алесю Вераб'ю.** У адказ на твой верш „На змаганьне“ кажам: пачакай пісаць вершы. Пішы дописы аб жыцьці моладзі.

**С Герасімовічу.** Вершы „Пастушок“ і „Сьвіслач“ друкавацца ня будуць. Слабыя.

**Я Відуку.** Твой верш „Традыцыям архіўных традыцый“ занадта „мудры“. Ты так перастараўся напісаць, што нашыя чытачы нічога і не зразумеюць. Ня пойдзе. Верш „Вёска, я сёньня цябе пакахаў“ страшэнна даўжэзны. Пры такім абмяжаваным месцы якое мае ў газэце Літкуток—ня пойдзе.

**С. Калядку** Раім падчытаць творы маладнякоўцаў і расійскіх пролетарскіх поэтаў. У іх ты ўгледзіш, як трэба пісаць. Твой верш „Комсамол“ слабы.

**Алесю Нуйму.** Ад цябе рэдакцыя чакала больш моцнага верша. Верш «Прымі» друкавацца ня будзе.

**Б. Аўдзюшка.** Зьмясьці свае вершы „Восень“ і „Адлёт птушак“ у вашай школьнай насьценнай газэце. Вершы „Я“ і „Сьпявайце“ слабыя.

**С. Калугіну** (Мсьціслаў). Аб „Лёсе вёскі“ пісалі нашыя песьняры дыкуды лепш за цябе. Верш „Лёс вёскі“ друкавацца ня будзе.

**Ф. Трахвянкову.** Верш „Комсамольцы“ слабы. Чытай творы беларускіх пісьменьнікаў і па іх вучыся як пісаць.

# Спэктакль „Ін енэ тэг“.

Новая пастаноўка яўрэйскага драмгуртка клюбу „КІМ“



*Аўтар п'есы Л. Кацовіч.*

... Чакалі, чакалі—і дачакаліся!

Два з паловай месяцы напружанай працы пасьля 8-мігадзіннага рабочага дню, пасьля 5 гадзін вячэрняй школы, бясспынныя рэпэтыцыі ад паловы 11-ай да першага часу ночы, каб на заўтра—зноў да варштату, зноў да швейнай машыны—вось у якіх умовах рыхтаў ў яўрэйскі драмгурток клюбу „КІМ“ сваю новую пастаноўку Пастаноўка гэта—п'еса маладога друкара Лазара Кацовіча „Ін енэ тэг“ („У тыя дні“) Рэжысёр—працаўнік яўрэйскага Дзяржаўнага тэатру Б. НОРД.

Што ўяўляе сабою п'еса?

„У тыя дні“ ў 1920 годзе Беларусь была пад белапольскай окупацыяй. У багатым доме яўрэйскага фабрыканта Рубінштэйна жыве агент дэфэнзывы У яго шмат сакрэтных папер.

Пан Рубінштэйн падлізваецца да польскай улады. Ён наладжвае банкет у гонар „яснавяльможных“.

Дачка пана Рубінштэйна Роза парывае з бацькамі і ўходзіць да комсамольцаў.

І вось калі банкет знаходзіцца ў самым распале, група комсамольцаў пры дапамозе Розы выкрадвае сакрэтныя паперы ў агента дэфэнзывы. У канцы першай дзеі агэнт выкрывае ў сябе прапажу.

Другі акт. Падпольная кватэра дзе друкуюцца проклямацыі. Тут знаходзіцца рэволюцыйны штаб, адсюль ідуць усе загады. Жандармэрыя зьяўляецца з «візітам», хлопцы змагаюцца з імі на жыцьцё і на сьмерць.

Трэці акт. Сынагога. У горадзе яўрэйскі пагром. Палякі адступаюць. Усе бягуць хавацца ў сінагогу. Пан Рубінштэйн з рабінам хаваюць грошы ў „орэн койдэш“ (сьвятое месца). Рабочыя на вуліцы змагаюцца з белымі за свае вызваленьне, а крамары і гандляры сідзяць у сінагозе і бядуюць аб тым, што не пасьпелі адмяніць польскія грошы на золата...

Краўнік партызанаў трапляе ў сінагогу, ранены. Здалёку чуваць марш перамогі. Гэта чырвонаармейцы, ўступаюць у горад. Янка (партызан) кідаецца да вакна клікаць таварышоў, але тут яго насьцігае апошняя куля апошняга польскага легіонэра...

Вось, у каротхіх рысах, зьмест п'есы.

Глядачы былі ў захапленьні. Да гэтага часу на падмостках комсамольскага клюбу ня было такой пастаноўкі. Усё тое, што кахае моладзь, маецца ў „Ін енэ тэг“. Тав. Норд майстэрскі замяніў старыя яўрэйскія скокі, музыку, сьпевы—новымі сучаснымі матывамі. У п'есе ёсьць прыгожая кадрыль, якая характарызуе спакой і ўпэўненасьць яўрэйскай буржуазіі пад скрыдламі паненых польскіх афіцэраў. Ёсьць скокі, характарызуючыя хцівасьць да грошай яўрэйскай буржуазіі і г. д.

Наша моладзь усё гэта ня бачыла.

Але няма нічога ў сьвеце, каб ня мела-б памылак. Памылкі і тут маюцца, але невялічкія, якія можна лёгка выправіць.

У п'есе ёсьць рэальныя моманты: бульба, проклямацыі, карты. І побач з гэтым у п'есе ёсьць шмат далёка нерэальных месц: калі Наста зачыняе дзьверы, яна махае рукой у паветры; калі Роза перадае Янкелю паперы, дык дае не паперы, а жменю паветры.

Калі рэальна—дык на ўсе 100 процантаў. А калі не — дык навошта бульба і проклямацыі.

П'еса павінна быць вытрымана ў аднолькавых мастацкіх тонах.

У другім акце, калі хлапцы разьвітаюцца на падпольнай кватэры, мала адчуваецца рэволюцыйнага натхненьня. Неяк халаднавата выходзіць...

Няўдалы момант дэклямацыі Янкелям проклямацыі Чаму гэта трэба паказаць глядачу, што комсамолец вызубрыў проклямацыю „на зубок“. Гэта ж няжыцьцёва!

Канец 3-га акту зусім ня вытрыманы. Пад гукі музыкі і выкрыкі Розы „Мацней шэрагі!“ уздымаецца ўвесь „пролетарыят“—гандляры, рабін і кампанія...

Зразумела, што ўсё гэта дробязі!

Наогул п'еса пакідае добрае ўражаньне. Гледачы захоплены, яны граюць разам з акцёрамі, перажываюць усё, што робіцца на сцэне, бо ўсе гэта ім знаёма.

Наш юнацкі рэпэртуар абагаціўся яшчэ адной п'есай.

„Шчыльней шэрагі вакол гуртка“—кажам мы, як Роза ў канцы п'есы.

Уся рабочая моладзь Менску павінна бачыць „Ін енэ тэг“.

Н. ВАЙНГАЎЗ.

## АПАВЯШЧЭНЬНІ

У пятніцу 28 студзеня г. г. а 7 ай гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу К. Маркса, адбудзецца вечар прысьвечаны 50 гадзьдзю рэволюцыйнага руху ў Польшчы.

Уваход па партыйных і запрашальных білетах.

### Згублены

Комсамольскі білет № 1093 выд. Мен. АК на імя Нахамкінай.

Часовае пасьведчаньне выд. Мен. АК № 1753 на імя Багуша.

Кандыдацкая картка № 34 выд. Менакругкомам Ліпкевічу У.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК

Галоўлітбел № 23709 2-ая Дзяржрукарня БДВ.